1914 2014

# ДАКТАРЫ І КАНДЫДАТЫ НАВУК БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА імя МАКСІМА ТАНКА

## (да 100-годдзя з дня заснавання)




Репозиторий БГПУ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

# Дактары і кандыдаты навук
## Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка
## (да 100-годдзя з дня заснавання)

***Біябібліяграфічны даведнік***

Репозиторий БГПУ

Мінск 2014

УДК 016:378
ББК 91.9:74
Д149

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Укладальнік *Г.У. Карзенка*, доктар гістарычных навук, прафесар

Пад агульнай рэдакцыяй
доктара педагагічных навук, прафесара, рэктара БДПУ *А.І. Жука*

Репозиторий БГПУ

**Дактары** і кандыдаты навук Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта
Д149 імя Максіма Танка (да 100-годдзя з дня заснавання) : біябібліягр. давед. / уклад. Г.У. Карзенка ; пад агул. рэд. д-ра пед. навук, праф. А.І. Жука. – Мінск : БДПУ, 2014. – 192 с.
ISBN 978-985-541-192-6.

У выданні прадстаўлены звесткі пра дактароў і кандыдатаў навук БДПУ. Паведамляюцца кароткія даныя з іх біяграфіі. Адлюстраваны этапы службовай і навуковай кар'еры, грамадская дзейнасць і ўзнагароды. Змешчаны спіс асноўных прац, апублікаваных навукоўцамі.

**УДК 016:378**
**ББК 91.9:74**

**ISBN 978-985-541-192-6**

© Карзенка Г.У., укладанне, 2014
© БДПУ, 2014



# *Паважаныя чытачы!*

У 2014 годзе Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка адзначае знамянальны юбілей: старэйшай навучальнай установе г. Мінска, вядучай педагагічнай ВНУ Рэспублікі Беларусь спаўняецца 100 гадоў.

Творчымі і плённымі поспехамі ў працы сустракае гэту ўрачыстасць згуртаваны прафесарска-выкладчыцкі калектыў універсітэта, намаганні якога накіраваны на навучанне і выхаванне студэнтаў — будучых настаўнікаў і высокаадукаваных спецыялістаў.

Падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў з вышэйшай адукацыяй — гэта мэтанакіраваная дзейнасць універсітэта на працягу свайго векавога існавання. За адзначаны перыяд ва ўніверсітэце былі створаны і зараз функцыянуюць вядомыя навуковыя школы, распрацоўваюцца інавацыйныя тэхналогіі, укараняюцца сучасныя метады ў падрыхтоўцы спецыялістаў па ўсіх галінах педагагічнай навукі. Дзясяткі тысяч выпускнікоў працягваюць перадавыя педагагічныя традыцыі, эфектыўна працуюць ва ўстановах адукацыі рознага ўзроўню і фарміруюць будучае пакаленне беларускай моладзі.

БДПУ валодае важкім кадравым патэнцыялам з высокім кваліфікацыйным узроўнем. Прафесарска-выкладчыцкі састаў — гэта 922 выкладчыкі, сярод якіх 68 дактароў навук, прафесараў і 350 кандыдатаў навук, дацэнтаў. Стрыжнем сучаснай кадравай палітыкі ўніверсітэта была і застаецца стратэгічная лінія на пераемнасць пакаленняў, заснаваная на векавых традыцыях. У наш час вядзецца сістэмнае абнаўленне кадраў, ажыццяўляецца падбор у магістратуру і аспірантуру найбольш здольных да навукі выпускнікоў універсітэта.

У даведачным выданні ўпершыню прадстаўлена сістэматызаваная інфармацыя пра кадры вышэйшай навуковай кваліфікацыі БДПУ (па стане на 01.01.2014 г.): кароткія біяграфічныя звесткі, этапы службовай і навуковай кар'еры, даныя аб абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, атрыманні навукова-педагагічных званняў, адлюстравана навуковая і грамадская дзейнасць, атрыманыя гранты, узнагароды, праблематыка даследаванняў, асноўныя навуковыя працы і інш.

Кніга «Дактары і кандыдаты навук Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка (да 100-годдзя з дня заснавання)» дазволіць больш дакладна і аб'ектыўна адлюстраваць пазітыўны вобраз універсітэта не толькі сярод вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі, але і за яе межамі. Прафесарска-выкладчыцкі састаў БДПУ — гэта эліта педагагічнай адукацыі, навуковай думкі Рэспублікі Беларусь, сведчанне высокай якасці ўзроўню выкладання ў вядучай педагагічнай ВНУ, а таксама яе магчымасцей інтэграцыі ў міжнародную навукова-адукацыйную супольнасць.

Рэктар БДПУ,
доктар педагагічных навук,
прафесар
*А.І. Жук*




Репозиторий БГПУ

# РЭКТАР

## ЖУК АЛЯКСАНДР ІВАНАВІЧ



Репозиторий БГПУ

Нарадзіўся 10.10.1956 г. у г. Мінску. У 1979 г. скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Матэматыка». Доктар педагагічных навук, прафесар. З 1979 г. – асістэнт кафедры тэорыі функцый БДУ. У 1983 г. паступіў у аспірантуру Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага, якую паспяхова скончыў у 1986 г., датэрмінова абараніўшы кандыдацкую дысертацыю па методыцы выкладання матэматыкі. Працаваў настаўнікам матэматыкі ў СШ № 34 і № 170 г. Мінска, сакратаром камітэта камсамола БДУ, выкладчыкам кафедры геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, дацэнтам гэтай жа кафедры. Аляксандр Іванавіч стаяў ля вытокаў стварэння ліцэя БДУ, быў яго першым дырэктарам. Свой прафесійны шлях А.І. Жук працягваў на пасадзе рэктара Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі.

У 1997 г. узначаліў Акадэмію паслядыпломнай адукацыі. У 2000 г. быў прызначаны першым прарэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, а ў 2001 г. – першым намеснікам міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь. З 3 мая 2014 г. – рэктар установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».

А.І. Жук быў кіраўніком міжгаліновай рабочай групы па распрацоўцы Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Дзяржаўных праграм развіцця вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай адукацыі на 2011–2015 гг., старшынёй навукова-тэхнічных саветаў па



галіновых навукова-тэхнічных праграмах «Адукацыя і кадры» на 2003–2005 гг., «Адукацыя і здароўе» на 2006–2008 гг., «Сучаснае адукацыйнае асяроддзе» на 2009–2011 гг., навуковым кіраўніком Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і грамадства» на 2006–2010 гг.

А.І. Жук мае 209 публікацый, у тым ліку 5 манаграфій, вучэбных дапаможнікаў, а таксама навуковыя і навукова-метадычныя артыкулы. Яго манаграфія «Праблемы прафесійнай кампетэнтнасці кадраў адукацыі: змест і тэхналогіі атэстацыі» лягла ў аснову ІПК як цэнтра развіцця адукацыйных практык. На аснове гэтай мадэлі працуюць Акадэмія паслядыпломнай адукацыі і 7 абласных інстытутаў развіцця адукацыі. Падрыхтаваў 2 дактароў і 9 кандыдатаў навук. Аляксандрам Іванавічам створана практыка-арыентаваная навуковая школа, у склад якой уваходзяць 3 дактары навук і больш за 20 кандыдатаў навук.

А.І. Жук узначальвае Савет па абароне доктарскіх дысертацый па педагагічных навуках пры БДПУ, з'яўляецца галоўным рэдактарам навукова-метадычных часопісаў «Адукацыя і выхаванне», «Весці БДПУ», старшынёй Рэспубліканскага савета па каардынацыі навуковых даследаванняў у галіне псіхолага-педагагічных навук, навуковым кіраўніком Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава» на 2011–2015 гг. (падпраграма «Адукацыя»).

А.І. Жук – намеснік старшыні савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, член Савета па адукацыі пры Інтэграцыйным Камітэце ЕўрАзЭС, член калегій Вышэйшай атэстацыйнай камісіі і Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь.

***Узнагароджаны*** Ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміі навук, Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, Міністэрства адукацыі, нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі» і інш.

***Навуковыя інтарэсы:*** педагогіка, кіраванне развіццём адукацыі, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка кадраў адукацыі, тэарэтычныя асновы дзейнасці інстытутаў павышэння кваліфікацыі, інаватыка ў галіне педагагічных навук і ў сферы адукацыйнай практыкі.

### *Асноўныя публікацыі*

- Деятельностный подход в повышении квалификации: активные методы обучения. Минск, 1994.
- Проблемы профессиональной компетентности кадров образования: содержание и технологии аттестации. Минск, 1996 (в соавт.).
- Управленческие и дидактические аспекты технологизации образования. Минск, 2000 (в соавт.).
- Гуманизация и гуманитаризация математического образования в школе. В 3 ч.
  Ч. 1. Теория и методика;
  Ч. 2. Сборник задач;
  Ч. 3. История математики. Минск, 2000.
- Активные методы обучения в системе повышения квалификации педагогов. Минск, 2003.
- Основы педагогики. Учеб. пособие для студ. непедагогич. спец. вузов. Минск, 2003.
- Управление качеством образования: теория и практика (коллективная монография). Минск, 2008 (в соавт.).






Репозиторий БГПУ